Міжнародны дзень роднай мовы, міжнародны дзень матчынай мовы — адмысловы дзень, асаблівы для кожнай нацыі, кожнага чалавека, кожнай установы адукацыі. Лельчыцкая раённая гімназія штогод праводзіць прадметны Тыдзень беларускай мовы, літаратуры і гісторыі напярэдадні і ў дзень гэтага свята. Свае цікавыя напрацоўкі дэманструюць настаўнікі гімназі, творчыя здольнасці праяўляюць навучэнцы. А ўсе разам ствараюць сапраўднае свята роднай мовы і культуры.

У гэтым годзе ў Дзень роднай мовы для вучняў і настаўнікаў гімназіі быў праведзены QR-квест “Загадкі маёй радзімы”, падрыхтаваны настаўніцай беларускай мовы і літаратуры Ірынай Рыгораўнай Казачэнка.

Удзельнікі QR-квеста на старце атрымалі маршрутныя лісты і разгадвалі філворды з зашыфраванымі назвамі абласных цэнтраў Беларусі. Гэта і вызначала напрамак іх падарожжа. На станцыі “Літаратурная” трэба было выбраць і прасканіраваць заданне, вызначыць імя пісьменніка, ураджэнца пэўнага рэгіёна нашай краіны.

Далей падарожнікі спыняліся на станцыі “Архітэктурнай”. Заданні ў выглядзе QR-кода змешчаны на карце падарожжа. QR-код удзельника ў той вобласці, якую выбралі на Старце.Умова: прасканіраваць QR-код выбранага напрамку падарожжа (на карце размешчана спасылка на выяву вядомага помніка архітэктуры вобласці). Задача – пазнаць архітэктурны помнік рэгіёна.

Наступны пункт падарожжа Горад майстроў. У QR-кодах зашыфраваныя спасылкі на вырабы народных помыслаў Беларусі. Трэба назваць промысел па выяве і ўпісаць яго ў маршрутны ліст.

Спыняцца не трэба, таму што да сябе запрашае Модны фальварак. На плакаце з выявамі нацыянальнага адзення беларусаў удзельнікі счытвлі QR-код пад пэўным нумарам (ён прапісаны ў маршрутным лісце ад рукі індывідуальна для ўдзельніка) і запісвалі адказ.

Ніводнае падарожжа не абыходзіцца без таямніц. У Засценку “Таямнічы” знаходзіліся 6 канвертаў – 6 таямніц. Адну з іх і павінен быў разгадаць удзельнік.

І як жа без творчасці? Фінальным этапам праходжання маршруту быў наступны: прыдумаць рэкламу турыстычнага маршруту / пост для Інстаграма, які будзе прадстаўляць пройдзены маршрут.

Да падарожжа далучылася адміністрацыя гімназіі. Дырэктар і намеснікі дырэктара не толькі паспяхова прайшлі маршрут, але і атрымалі

новую для сябе інфармацыю з літаратурнай спадчыны краіны. Пра гэта сведчаць створаныя імі рэкламныя слоганы: “Падарожнічай! Вывучай Беларусь.BY!” “Падарожжа ў Магілёў# Аўтар верша Куляшоў# Святога Станіслава сабор”.

Запрашаем усіх жадаючых далучыцца да вывучэння таямніц сваёй радзімы.

**Звесткі пра аўтара**



| | |
|---|---|
| Прозвішча, імя, імя па бацьку | Казачэнка Ірына Рыгораўна |
| Пасада | Настаўнік беларускай мовы і літаратуры, кваліфікацыйная катэгорыя “настаўнік-метадыст” |
| Установа адукацыі | ДУА “Лельчыцкая раённая гімназія” Гомельскай вобласці |
| Электронная пошта, тэлефон | kristina_fink@bk.ru; 80293581798 |